Паўночны гарадок майстроў / падрыхт. В. Антоненкава // Настаўніцкая газета. – 2023. – 30 чэрв. – С. 20.

**Паўночны гарадок майстроў**

*За сваю 40-гадовую гісторыю Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны каледж падрыхтаваў каля 15 тысяч тэхнароў і гуманітарыяў, якія разам маглі б утварыць сапраўдны гарадок майстроў.*

– Наш каледж шматпрофільны. Мы рыхтуем як па тэхнічных, так і па гуманітарных, творчых спецыяльнасцях. На ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі сёлета запрашаем 168 абітурыентаў, а на ўзровень сярэдняй спецыяльнай – 257. Да таго ж мы ажыццяўляем набор на платную форму навучання на аснове базавай адукацыі па спецыяльнасці «Правазнаўства» з прысваеннем кваліфікацыі «юрыст». Гэта вельмі запатрабаваная спецыяльнасць, на якую заўсёды вялікі конкурс і высокія прахадныя балы. У гэтым годзе чакаем 30 чалавек, – паведаміла адказны сакратар прыёмнай камісіі загадчыца аддзялення дакументазнаўства і правазнаўства каледжа Таццяна Зянькевіч.

Нагадаем, 15 чэрвеня пачаўся прыём дакументаў у каледжы на ўзровень ПТА. У Віцебскі тэхналагічны каледж падалі заявы ўжо каля паўсотні абітурыентаў. Сярод іх па-ранейшаму самымі папулярнымі застаюцца спецыяльнасці «Вытворчасць ювелірных вырабаў», «Аказанне фотапаслуг», «Эксплуатацыя, рамонт і абслугоўванне аўтамабіляў», «Лесагаспадарчыя работы».




Увогуле ж прафесійна-тэхнічная адукацыя ў каледжы прадстаўлена 14 кваліфікацыямі. З іх выключна для выпускнікоў 9 класаў прапануюцца наступныя: «аператар ЭВМ», «вытворца мастацкіх вырабаў з лазы», «станочнік дрэваапрацоўчых станкоў/рамшчык», «сталяр», «вальшчык лесу», «вадзіцель аўтамабіля катэгорыі С/слесар па рамонце аўтамабіляў», а пасля 11 класа –«ткач». А вось на кваліфікацыі «сакратар», «выканаўца мастацка-афарміцельскіх работ», «рэзчык па дрэве і бяросце», «ювелір», «вытворца мастацкіх вырабаў з керамікі», «аператар камп’ютарнай графікі» запрашаюць выпускнікоў як 9, так і 11 класаў.

Для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі на дзённае навучанне на аснове 9 класаў ажыццяўляецца набор на спецыяльнасці: «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» (кваліфікацыя «мастак. Настаўнік»), «Дрэваапрацоўчыя вытворчасці» (кваліфікацыя «тэхнік-тэхнолаг») і «Тэхнічная эксплуатацыя і рамонт транспартных сродкаў» («тэхнік-механік»). На «Распрацоўку і суправаджэнне праграмнага забеспячэння інфармацыйных сістэм» з прысваеннем кваліфікацыі «тэхнік-праграміст»– на аснове 9 і 11 класаў, на «Лясную гаспадарку» («тэхнік лясной гаспадаркі») – на аснове 9 класаў на бюджэт і пасля 11 на завочную форму навучання, а яшчэ на «Дакументацыйнае забеспячэнне кіравання» («сакратар-рэферэнт») – на аснове ПТА.

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны каледж сёлета адкрывае новую спецыяльнасць «Распрацоўка і суправаджэнне вэб-рэсурсаў» на аснове 9 класаў з прысваеннем кваліікацыі «тэхнік-праграміст».*

– Наш каледж – адзін з лідараў у рэгіёне па колькасці спецыяльнасцей. Яго адметнасць у тым, што тут сябе знаходзяць як тэхнары, так і гуманітарыі, бо ў нас поплеч добра суіснуюць новыя тэхналогіі і культурныя традыцыі, – адзначыла Таццяна Уладзіміраўна. – У гэтым годзе некаторыя нашы спецыяльнасці змянілі назвы. Так, ранейшая спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» цяпер называецца «Распрацоўка і суправаджэнне праграмнага забеспячэння інфармацыйных сістэм». Па ёй мы набіраем дзве групы на бюджэт на аснове агульнай базавай і агульнай сярэдняй адукацыі. Вельмі шмат заявак ад заказчыкаў кадраў на такіх спецыялістаў. Прахадны бал выпускнікоў 9 класаў у мінулым годзе склаў 8,7 бала. А яшчэ сёлета мы адкрываем новую спецыяльнасць «Распрацоўка і суправаджэнне вэб-рэсурсаў» на аснове 9 класаў з прысваеннем кваліфікацыі «тэхнік-праграміст» з планам набору 27 чалавек.

**Рэдкія і ўнікальныя**

У Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным каледжы можна набыць рэдкія прафесіі ювеліра і ткача, па якіх у краіне больш нідзе не рыхтуюць.

– Мы адзіныя ў краіне, хто ажыццяўляе падрыхтоўку па кваліфікацыі «ювелір». Звярнуць увагу на яе прапаноўваем уседлівым, цярплівым, акуратным і ўважлівым абітурыентам, якія маюць добрыя веды па хіміі і фізіцы. Каб стаць ювелірам, трэба адчуваць метал, умець вызначаць сіметрыю, мець мастацкі густ. У час вучобы нашы навучэнцы, зразумела, не працуюць з золатам, а трэніруюцца на латуні – матэрыяле, які па фізічных уласцівасцях нагадвае ювелірныя сплавы, – расказала Т. У. Зянькевіч.

Пасля выпуску маладыя людзі валодаюць майстэрствам апрацоўкі ўпрыгажэнняў, пачынаючы ад стварэння і заканчваючы іх рамонтам. Дарэчы, рамонт вырабаў – самы няпросты складнік рамяства, таму такія навыкі будучыя ювеліры атрымліваюць напрыканцы навучання. Размяркоўваюцца такія выпускнікі на ювелірныя заводы і кампаніі.

Зберагаюць у каледжы і народную творчасць, рыхтуючы на базе 11 класаў ткачоў. У майстэрні ткачоў размешчаны ручныя ткацкія станкі, нарыхтоўкі і безліч дываноў і габеленаў. Навучэнцы гэтага напрамку вывучаюць тэхнікі стварэння народных ручнікоў і так званых шпалер (габеленаў). Падобных спецыялістаў у Беларусі таксама больш нідзе не выпускаюць.

– Сёння ў модзе натуральныя матэрыялы і рэчы ручной працы, таму і ручное ткацтва перажывае новы росквіт. Магчымасці майстроў сталі шырэйшымі. З'явіліся сучасныя прылады, новыя матэрыялы і тэхналогіі па апрацоўцы. Усё гэта дазваляе ствараць вельмі складаныя, вытанчаныя вырабы і дэкарыраваныя касцюмы, – дадала Таццяна Уладзіміраўна.

***Адметнасць нашага каледжа ў тым, што тут сябе знаходзяць як тэхнары, так і гуманітарыі.***

**Таццяна ЗЯНЬКЕВІЧ.**

Ткачы размяркоўваюцца на мастацкія і афарміцельскія камбінаты, прадпрыемствы народных мастацкіх промыслаў, дамы рамёстваў, палацы культуры і творчасці, школы мастацтваў.

– Практыку нашы навучэнцы праходзяць на прадпрыемствах Віцебска і вобласці. Вельмі часта – на будучых месцах працы: у IT-кампаніях, прыватных арганізацыях па вырабе мэблі, на «Віцебскдрэве» і «Віцебсклесе». Па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве практыку арганізоўвае «Белмастацкераміка», ювеліры практыкуюцца на заводзе ZORKA, хто вучыцца на сакратароў – ва ўстановах розных сфер дзейнасці, бо ўсюды патрэбны памочнікі кіраўнікоў і г. д., – праінфармавала загадчыца аддзялення дакументазнаўства і правазнаўства.

**Аднаго разу мала**

Каледж мае добрую матэрыяльна-тэхнічную базу. Каб азнаёміцца з ёй у поўнай меры, трэба завітаць сюды неаднойчы.

– У нас свой гарадок, які складаецца з двух вучэбных карпусоў, ангараў, майстэрань, вучэбна-вытворчых лабараторый, сталовай, магазіна і нават басейна, – расказала Т. У. Зянькевіч.

А яшчэ ў 2019 годзе тут пачаў функцыянаваць цэнтр кампетэнцый тэхналогій дрэваапрацоўкі, у якім рыхтуюць рабочых і спецыялістаў для дрэваапрацоўчай галіны. Асноўным складнікам матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння цэнтра з'яўляюцца вучэбна-вытворчыя майстэрні каледжа, рабочыя месцы ў якіх абсталяваны ў адпаведнасці са стандартамі WorldSkills.

– Да нас прыязджаюць вучыцца і з іншых навучальных устаноў. Мы маем найноўшае абсталяванне па перапрацоўцы дрэва, якое штогод мадэрнізуем. У нас вялікі спектр магчымасцей для атрымання навыкаў канструявання і вырабу мэблі, – не без гордасці сказала адказны сакратар прыёмнай камісіі. – Да таго ж у каледжы працуюць высокакваліфікаваныя выкладчыкі, майстры вытворчага навучання. Сярод іх – выпускнікі розных УВА краіны з багатым практычным вопытам. Яны прывіваюць маладым людзям любоў да сваёй прафесіі.

Што тычыцца геаграфіі навучэнцаў Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжа, то яна не абмяжоўваецца паўночным рэгіёнам. Тут вучацца маладыя людзі з усёй краіны. Па словах Т. У. Зянькевіч, колькасць юнакоў і дзяўчат у каледжы амаль аднолькавая, усяго ж іх каля 1,1 тысячы. Толькі адзінкавыя кваліфікацыі больш «дзявочыя», напрыклад, «сакратар-рэферэнт», ці больш «хлапечыя» – «тэхнік-механік».

Дарэчы, выпускнікі атрымліваюць дыпломы Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, паколькі каледж уваходзіць у структуру гэтай установы. Пасля ў БДТУ яны могуць паступаць на скарочаную форму навучання без уступных экзаменаў на спецыяльнасці «Тэхналогія дрэваапрацоўчых вытворчасцей», «Лясная гаспадарка», «Сэрвіс і інжынерынг лясных машын і абсталявання» і інш.

– Многія нашы юрысты пасля заканчэння каледжа паступаюць у ВДУ імя П. М. Машэрава. Прычым звычайна яны займаюць усе 10 бюджэтных месцаў, бо ўзровень падрыхтоўкі нашых юрыстаў вельмі высокі, – падкрэсліла Таццяна Зянькевіч. – Хацелася б, каб у тых, хто сёлета прыйдзе да нас, гарэлі вочы і яны сапраўды былі зацікаўлены ў асваенні выбранай спецыяльнасці.

**Матэрыялы Вольгі АНТОНЕНКАВАЙ.**